Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 САКАВІКА 2017 г. ПЯТНІЦА № 56 (28420)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Што небяспечна набываць праз інтэрнэт?**

СТАР. 4



**Разумным быць модна**

СТАР. 5



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

# ПРЭЗІДЭНТ ГАРАНТУЕ: МІР І СПАКОЙ У КРАІНЕ БУДЗЕ ЗАХАВАНЫ

**Кіраўнік дзяржавы правёў нараду па пытаннях гарантавання грамадскай бяспекі. Ключавая ідэя нарады — улада нічога і нікога не баіцца і здольная захаваць парадак у дзяржаве**

СТАР. 2



Фота БЕЛТА.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# САПРАЎДНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ВЯСНА

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Ігар КАРПЕНКА, міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь:**

*«Сфера адукацыі сёння ва ўсіх на слыху, і бадай што толькі лянівы не выказаў сваё меркаванне або «за», або «супраць», або не пахваліў яе, або не пакрытыкаваў. Адукацыя заўсёды дае падставы для грамадскага рэзанансу. Але ёсць пытанні карпаратыўнай этыкі, і не ўсё, што абмяркоўваецца ў настаўніцкай, трэба рабіць прадметам грамадскай дыскусіі. Стварэнне вучэбных праграм, школьных падручнікаў, іх пастаяннае ўдасканальванне — сфера дзейнасці прафесіяналаў. Таму адна з задач грамадска-кансультацыйнага савета па пытаннях адукацыі, які мы плануем стварыць,— праводзіць тлумачальнай работы і ўдзел у фарміраванні грамадскай думкі па пытаннях дзяржаўнай палітыкі, якая рэалізуецца ў сферы адукацыі».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.03.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,8842 | ▼ |
| Еўра | 2,0326 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0326 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0694 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Сацыяльны клопат

## Каб бацькам была палёгка

**Дэпутат тлумачыць сутнасць законапраекта па дзярждапамогах сем'ям**

**На мінулай сесіі Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу ў першым чытанні прыняла праект Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей». Каб зразумець, што зменіць гэты законапраект у дзейным заканадаўстве, карэспандэнт «Звязды» пагаварыў з намеснікам старшыні Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Валянцінай КУРСЕВІЧ, якая адказвае непасрэдна за падрыхтоўку дакумента.**



***— Якія новаўвядзенні змяшчае дакумент?***

— Існуюць сем'і, у якіх бацькі — інваліды або адзін з бацькоў з'яўляецца інвалідам першай ці другой групы, якога даглядае другі з бацькоў. Калі ў іх з'яўляецца дзіця, то з яго трох і да 18 гадоў сям'я будзе мець права атрымліваць дапамогу незалежна ад таго, паступіў малады чалавек ці дзяўчына ў прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную або вышэйшую навучальную ўстанову, нават на бюджэтную форму, або не. Гэта першае новаўвядзенне. Другое — сем'і, у якіх выхоўваюцца дзеці-інваліды, будуць мець права атрымліваць дапамогу да дасягнення дзіцем 18 гадоў у выпадку няпоўнага працоўнага дня. Гэта значыць бацькі могуць працаваць, напрыклад, на паўстаўкі — і атрымліваць дапамогу.

СТАР. 2

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Працягваецца падпіска на «Звязду» на II квартал 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# ПРЭЗІДЭНТ ГАРАНТУЕ: МІР І СПАКОЙ У КРАІНЕ БУДЗЕ ЗАХАВАНЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Многа было разважанняў і размоў — рабіць гэтую нараду адкрытай, закрытай... Я прытрымліваюся аднаго пункту гледжання: мы нічога ні ад каго не павінны закрываць. Наколькі гэта магчыма, мы павінны сумленна, адкрыта абмяркоўваць тыя пытанні, якія хвалююць нашых людзей і, натуральна, не могуць не хваляваць нас. Вось увесь адказ на некаторыя перасцярогі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка на пачатку нарады.

Кіраўнік дзяржавы пракаментаваў сітуацыю, якая, як ён сам прызнаўся, ставіць яго ў няёмкае становішча, — калі напярэдадні пэўных падзей улады як быццам бы пачынаюць некага запалохваць. «Бачу, што ходзіць такая шалёная думка ў кагосьці. Я гэтым спадарам хачу сказаць, што ўлада сёння абсалютна нікога не баіцца. Асабліва што датычыцца Прэзідэнта. Мы праводзім сумленную, адкрытую палітыку», — заявіў кіраўнік дзяржавы

Улада змагла зберагчы краіну, яе суверэнітэт, і гэта пра многае гаворыць.

— Мы не раскралі краіну, не расцягнулі яе на кавалкі, не раздалі ўласнасць, хоць сёй-той унутры і асабліва звонку марыць падзяліць тут сёе-тое. Мы праводзілі тую палітыку, якую абяцалі падчас прэзідэнцкіх выбараў. Тым не менш неяк непрыемна чуць, што мы некага пужаем, — прызнаўся Аляксандр Лукашэнка. — Я хачу сказаць, што мы нікога не пужаем і пужаць не будзем. Але мы будзем вельмі жорстка кіравацца выкананнем законаў і Канстытуцыі краіны. Мы нікому не закрываем рот, я ўжо казаў пра гэта, але крок улева, крок управа ад закона будзе самым жорсткім чынам перапыняцца.

Чаму? Беларусь — спакойная, утульная краіна з прыгожымі, чысценькімі гарадамі і вёскамі, дзе можна добра жыць і гадаваць дзяцей. Але захаванне ўсяго гэтага, і тых жа спакою, бяспекі ў прыватнасці, даецца няпроста, зазначыў кіраўнік дзяржавы і рэзюмаваў:

— Калі мы недзе парушым гэты парадак, заўтра будзе так, як у нашых суседзяў. Калі нехта хоча гэтага — а такія ёсць, няхай мізэр, але ёсць, — яны павінны разумець, што мы, нікога не запужваючы, заклічам іх да парадку.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

❍ КАМЕНТАРЫІ Ў ТЭМУ

## ДЭМАНСТРУЕМ ЕЎРАПЕЙСКАСЦЬ



**Старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Ігар МАРЗАЛЮК:**

— Калі едзеш з аэрапорта, можна ўбачыць такі білборд: ляціць чарада буслоў і напісана «парадак ва ўсім». Гэта тое, што характарызуе Беларусь. Самадысцыпліна і здольнасць рабіць нешта для сваёй краіны. Чысціня на вуліцах — гэта чысціня ў памкненнях. І гэта заслуга дзяржавы і інстытутаў, якія гэтым займаюцца. Ведаеце, як у дэ Сент-Экзюперы: прачнуўся зранку — прыбяры сваю планету. Дык вось, Беларусь заўсёды прыводзіць у парадак сваю частку планеты. Такім чынам мы дэманструем еўрапейскасць.



**Іван САВЕРЧАНКА, доктар філалагічных навук, прафесар, дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі:**

— У нас з даўніх часоў добрая традыцыя талерантнасці: людзі спакойна ставяцца да іншых людзей. Але для таго, каб праяўляць гэтую якасць, павінны быць адпаведныя бяспечныя ўмовы. І з гэтым у апошнія дваццаць гадоў, на мой погляд, дзяржава спраўляецца. Для выхавання культуры органаў бяспекі, праваабарончых органаў, міліцыі, пракуратуры таксама зроблена шмат. Я многіх з іх прадстаўнікоў ведаю, выступаю з лекцыямі перад імі. Сёння гэта адукаваныя, выхаваныя, культурныя людзі.

Тэракты, выбухі ў Еўропе дапамагаюць нам ацаніць гэтыя дасягненні. Навукоўцы з тых жа еўрапейскіх краін глядзяць на нас як на ўзор у гэтым плане. Бо калі захоўваецца спакой, тады ёсць і ўмовы для навуковага і творчага росту. Нядаўна гутарыў з нашымі маладымі людзьмі, абмяркоўвалі з імі сітуацыю ва Украіне, і хтосьці выказаў думку, што там не хапае такога парадку, як у нашай краіне. Не хапае таго чалавека, хто змог бы яго навесці.

Але пры ўсім станоўчым трэба спакойна ставіцца да крытыкі, бо не бывае ўсё ідэальна. Гэта датычыцца кожнай сферы жыцця: культуры, навукі, адукацыі. Усе мы разам павінны дбаць і пра іх, і пра бяспеку. Гэта мусіць быць агульны клопат беларусаў.

# ДЫЯЛОГ ТРЭБА ПРАЦЯГВАЦЬ

## Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з дакладчыкам па Беларусі ад ПАСЕ

**Дыялог паміж нашай дзяржавай і Саветам Еўропы ідзе з 1992 года. Былі часы, калі кантакты амаль прыпыняліся, але сёння дыялог развіваецца не толькі паступова і актыўна, але і раўнапраўна. Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з дакладчыкам па Беларусі Камісіі па палітычных пытаннях і дэмакратыі Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы (ПАСЕ) Андрэа Рыгоні.**

— Перш за ўсё хачу вам падзякаваць за тое, што вы разабраліся ў сітуацыі ў Беларусі і настроены на тое, каб у любым працэсе быў пазітыў, — сказаў Прэзідэнт, вітаючы госця. — Такіх палітыкаў сёння мала, кожны пераследуе нейкія мэты, але вы пераследуеце высакародныя мэты. Вы садзейнічаеце збліжэнню пазіцый нават самых антаганістычных сіл. Нягледзячы на рознагалоссі па пэўных палітычных пытаннях, якія існуюць паміж намі і саюзам, усё-такі вы імкнуліся надаць нашым адносінам пэўную пазітыўную дынаміку. Вось за гэта я вам удзячны.

Трэба сказаць, што кіраўнік парламенцкай дэлегацыі Італіі ў ПАСЕ, намеснік старшыні ПАСЕ Андрэа Рыгоні ўжо другі раз выступае дакладчыкам па Беларусі. Першая яго такая місія цягнулася з 2007 па 2009 год. Менавіта ў той перыяд з'явіліся перадумовы для паступовага «размарожвання» адносін нашай краіны і гэтай парламенцкай арганізацыі. Тады па выніках працы Андрэа Рыгоні падрыхтаваў даклад, у якім змяшчаўся прызыў аднавіць статус «спецыяльна запрошанага» для Нацыянальнага сходу Беларусі без ніякіх папярэдніх умоў. Другі раз італьянскі дэпутат заняў пост дакладчыка па Беларусі ў 2014 годзе, гэтая яго місія працягваецца і па сёння.

— Вельмі важна, што вы разумееце, у якой сітуацыі сёння знаходзіцца Беларусь і наколькі часам складана нават на прынцыпах развітой дэмакратыі Еўрапейскага саюза ў Беларусі дзейнічаць, — адзначыў кіраўнік краіны. — Усё гэта не так проста. Мы часта кажам пра тое, што вы ва ўмовах цяперашняй палітычнай сістэмы жывяце ўжо, відаць, некалькі стагоддзяў. А мы яшчэ вельмі маладыя для таго, каб працаваць на вашым узроўні, — гэта па-першае. А па-другое, трэба разумець, што ў кожнай дзяржавы ёсць свая спецыфіка. Таму ўсялякія пытанні палітыкі, дыпламатыі, дэмакратыі трэба ўсё-такі пераламляць праз тую спецыфіку, у якой знаходзіцца тая ці іншая дзяржава, у тым ліку наша.

У той жа час сёння паміж Беларуссю і ПАСЕ ёсць дыялог.

— Мы па ўсіх пытаннях, якія ў вас выклікаюць трывогу, вядзём дыялог. Мы на сённяшні дзень не сядзім кожны за сваім плотам, а размаўляем. Гэта ўжо вялікая справа. У дыялогу, я думаю, нараджаецца ісціна, і з часам гэта ісціна будзе і ў нашых адносінах.

Андрэа Рыгоні падзякаваў Прэзідэнту Беларусі за магчымасць асабістай сустрэчы. Па словах дакладчыка, яна не толькі паказвае, што наша дзяржава адкрыта да дыялогу, але і сведчыць пра вельмі цёплае і пазітыўнае стаўленне Беларусі да працэсу развіцця адносін з Саветам Еўропы і Еўропай у цэлым.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Узровень тэрарыстычнай пагрозы ў Вялікабрытаніі не будзе павышаны

Пра гэта пасля завяршэння пасяджэння надзвычайнага ўрадавага камітэта КОБРА заявіла прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Тэрэза Мэй. «Быў усталяваны сур'ёзны ўзровень тэрарыстычнай пагрозы ў Злучаным Каралеўстве на пэўны перыяд часу, ён застанецца нязменным», — сказала кіраўнік урада. Як вядома, у сераду ў цэнтры брытанскай сталіцы невядомы мужчына наехаў на пешаходаў, а затым накінуўся з нажом на паліцэйскага. Адказнасць за тэракт узяла на сябе групоўка «Ісламская дзяржава». У выніку яго загінулі чацвёра чалавек, каля 40 пацярпелі.

### Экспарт бразільскага мяса за тыдзень зменшыўся ў 850 разоў

Штодзённы аб'ём экспарту бразільскай жывёлагадоўчай прадукцыі скараціўся на фоне скандалу, які разгарэўся вакол выпадкаў паступлення ў продаж няякаснага мяса ад мясцовых вытворцаў. У канцы мінулага тыдня паліцыя краіны арыштавала больш за 30 удзельнікаў буйной злачыннай групоўкі, якая займалася продажам пратэрмінаваных прадуктаў харчавання, у першую чаргу мяса. Як паведамілі ў праваахоўных органах, гэтая спецаперацыя стала самай маштабнай у гісторыі краіны — у ёй прынялі ўдзел каля 1,1 тыс. вартавых правапарадку.

### Метэаролагі выпусцілі атлас з 12 новымі тыпамі аблокаў



Сярод іншых у новае выданне атласа — першае за 30 гадоў — трапілі вельмі незвычайныя аблокі, падобныя на марскія хвалі, калі на іх глядзець з-пад вады. Упершыню яны былі сфатаграфаваны ў 2006 годзе ў амерыканскім штаце Аява. У папоўнены спіс былі таксама ўключаны і аблокі, якія нагадваюць формай трубу, што цягнецца ўздоўж лініі гарызонту. Навукоўцы кажуць, што абнавіць атлас дапамаглі фатаграфіі, зробленыя шматлікімі метэаролагамі-аматарамі на свае смартфоны. Акрамя аблокаў, у атлас таксама ўключаны звесткі пра рэдкія віды вясёлак, снежных смерчы і г.д.

# Адбылася тэлефонная размова Аляксандра Лукашэнкі з Алмазбекам Атамбаевым

Алмазбек Атамбаеў запрасіў Аляксандра Лукашэнку на пасяджэнне Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета для абмеркавання актуальных пытанняў і праблем. Чарговы саміт лідараў краін Еўразійскага эканамічнага саюза запланавана правесці ў красавіку-маі 2017 года ў Бішкеку.

На парадку дня падчас тэлефоннай размовы кіраўнікоў дзяржаў таксама былі пытанні двухбаковых адносін, у прыватнасці пашырэння гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва. Аляксандр Лукашэнка і Алмазбек Атамбаеў выказалі ўзаемную зацікаўленасць у далейшым нарошчванні аб'ёмаў гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі, паведамляе прэс-служба беларускага лідара.

# Каб бацькам была палёгка

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Трэцяе: дзеткі-інваліды розныя — ёсць першая, другая, трэцяя і чацвёртая ступені страты здароўя. Найбольш складаныя — гэта апошнія дзве. Сёння гэтыя дзеці пры дасягненні трохгадовага ўзросту атрымліваюць дапамогі. Мы будзем разглядаць папраўку, згодна з якой тым, хто даглядае дзяцей трэцяй і чацвёртай ступеняў страты здароўя, дапамога будзе павялічана на 20 працэнтаў па дасягненні імі 18 гадоў. Чацвёртае: атрыманне дапамогі па часовай непрацаздольнасці — бацькі будуць атрымліваць дапамогу, калі дзіця-інваліда адправілі ў санаторый або на медыцынскую рэабілітацыю.

Яшчэ адно нованаўвядзенне: сёння права на атрыманне дапамогі па цяжарнасці і родах маюць толькі жанчыны, якія сталі на ўлік да 12 тыдняў цяжарнасці ў дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя. У законапраекце прадугледжаны выплаты ў выпадку звароту і ў недзяржаўныя арганізацыі, але толькі калі жанчына стане на ўлік да 12 тыдняў і будзе выконваць усе рэкамендацыі ўрача. Акрамя таго, удакладняюцца катэгорыі грамадзян, якія могуць атрымліваць дапамогу, а таксама ўводзяцца дадатковыя ўмовы для атрымання. А менавіта — тэрмін пражывання бацькоў на тэрыторыі Беларусі ў выпадку нараджэння дзіцяці за межамі краіны. Ён павінен быць не меншы за 6 месяцаў у межах года, які папярэднічае нараджэнню дзіцяці. І апошняе: мы прапануем павысіць памер дапамогі па цяжарнасці і родах у тых выпадках, калі яе памер быў меншы, чым сума дапамогі па доглядзе дзяцей ва ўзросце да трох гадоў за перыяд з моманту нараджэння дзіцяці па дзень, на які выплачана дапамога па цяжарнасці і родах, — напрыклад, калі жанчына да наступлення цяжарнасці не працавала, была студэнткай.

***— Вялікая колькасць прапаноў звязана з неабходнасцю ўдасканаліць цяперашні закон?***

— Я не сказала б, што ў нашым заканадаўстве ёсць недахопы. Любы законапраект павінен быць гнуткай сістэмай мер, якая адлюстроўвае рэальную дэмаграфічную і сацыяльную сітуацыю па краіне. У 2013 годзе, калі прымаліся апошнія змены, была іншая мэта — павысіць нараджальнасць, якая па выніку была дасягнутая. А цяпер мы прапануем папраўкі, якія наспелі на сённяшні момант. Гэта значыць ідзе паступовае павышэнне сацыяльнай дапамогі дзяржавы тым сем'ям, якія маюць патрэбу ў гэтай дапамозе.

***— Згодна з законапраектам удакладняюцца катэгорыі асоб, якія могуць атрымліваць сацыяльную дапамогу. У чым сутнасць змен?***

— На сёння права на дапамогу маюць грамадзяне Беларусі, якія пастаянна пражываюць на нашай тэрыторыі, замежныя грамадзяне, асобы без грамадзянства, а таксама грамадзяне іншых дзяржаў і людзі без грамадзянства, якія часова пражываюць і на якіх распаўсюджваецца дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне, а яны выплачваюць узносы на гэтае страхаванне. Калі дапамога не выплачваецца? Згодна з дзейным заканадаўствам, калі дзеці пражываюць за межамі Беларусі — акрамя дзяцей дыпламатычных і консульскіх работнікаў. Таксама права на дапамогу не распаўсюджваецца на дзяцей-сірот, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні ў дзіцячых інтэрнатах, дамах, прыёмных сем'ях. У новым законапраекце прапісана: калі дзеці вучацца на дзённай форме навучання за мяжой Беларусі, то дапамога бацькам на іх не выплачваецца. Не будзе выплачвацца дапамога бацькам, калі іх дзеці знаходзяцца ў дамах дзіцяці або ўстановах адукацыі з кругласутачным рэжымам знаходжання, а таксама калі яны змешчаны ў стацыянарныя ўстановы сацыяльнага абслугоўвання.

***— Памер дапамог будзе павялічаны?***

— Да 2016 года ў Беларусі натуральнае змяншэнне насельніцтва пераважала над натуральным прыростам. Кіраўнік дзяржавы нядаўна паставіў задачу, каб насельніцтва павялічылася да 20 мільёнаў, — і гэта выдатная задача. Таму мы і прапаноўваем павялічыць памер дапамог. Гэта значыць для стымулявання ў тым ліку нараджальнасці, каб сем'і маглі паўнавартасна ўдзельнічаць у выхаванні дзяцей.

Дарэчы, пра выхаванне. Нядаўна наша камісія прымала ўдзел у рабочай групе Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Пачалася прапрацоўка такога пытання, як атрыманне абавязковага сацыяльнага водпуску бацькам пры нараджэнні дзіцяці. Гэта робіцца для таго, каб бацька прымаў удзел у выхаванні дзяцей з нараджэння. Сёння рабочая група абмяркоўвае тэрміны такога водпуску — у Швецыі, напрыклад, гэта 10 дзён. Таксама вывучаецца, калі лепш даваць такі водпуск — адразу пасля нараджэння або на працягу некалькіх месяцаў. Трэба разумець, што мужчына і сёння можа ўзяць такі водпуск, але толькі за свой кошт. А ў будучыні ён абавязкова зможа атрымаць магчымасць дапамагаць жонцы, пры гэтым маючы дзяржаўную падтрымку. Як бачыце, дзяржава не толькі павялічвае памер дапамогі, але і садзейнічае паўнавартаснаму развіццю сям'і.

***— Калі законапраект можа ўступіць у сілу?***

— Першыя два артыкулы законапраекта запрацуюць з першага ліпеня 2017 года. Гэта артыкул пра права на дзяржаўную дапамогу сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, а другі артыкул — заканадаўства аб дзяржаўных дапамогах. Усе астатнія артыкулы — з моманту афіцыйнага апублікавання дакумента. Папраўкі аб парадку вылічэння дапамог па доглядзе дзяцей да трох гадоў уступяць у сілу з першага лютага 2018 года.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.** *lukashevich@zviazda.by*

■ Блізкая ўлада

# НА ПРЫЁМ ДА ВІЦЭ-ПРЭМ'ЕРА

## У Талачынскім райвыканкаме асабісты прыём праводзіў намеснік кіраўніка беларускага ўрада Васіль Жарко

**Кожны з тых, хто пажадаў з ім сустрэцца, адчуў уважлівае стаўленне з боку суразмоўцы і яго гатоўнасць глыбока ўнікнуць у сутнасць пытанняў, нават дробных.**

Першай прынялі жанчыну, якая прывезла ў калясцы мужа, інваліда першай групы. Яна агучыла некалькі пытанняў. Сярод іншых і тыповую для краіны праблему: недахоп гарадскога транспарту для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, асабліва — з парушэннямі апорна-рухальнага апарату. У райцэнтры — толькі адзін такі аўтобус.

Наступны заяўнік прынёс папку папер. Ён разлічваў на падтрымку з нагоды, на яго погляд, несправядлівых рашэнняў судоў. Яго патрабаванні наконт выплаты кампенсацыі нават разглядалі ў Канстытуцыйным судзе, але не прызналі, што чалавек мае рацыю...



Падчас прыёму.

Чарговы наведвальнік затрымаўся ў кабінеце параўнальна надоўга. Прапанаваў актыўней укараняць лічбавыя тэхналогіі ў архівах, друкаваных СМІ. (У якасці добрага прыкладу, дарэчы, прывёў «Звязду», на сайце якой ёсць багаты архіў нумароў у фармаце PDF.) Карыстаючыся момантам, выказаў і прапанову ўвекавечыць памяць Героя Савецкага Саюза Льва Міхайлавіча Даватара. Ён жа — ураджэнец Віцебшчыны! Чаму б на фасадзе школы ў Аршанскім раёне, недалёка ад месца, дзе ваяваў, не замацаваць памятную дошку?

Дырэктар адзінай у райцэнтры гімназіі разлічвае на дапамогу ў цеплавой рэабілітацыі будынка. Усяго там вучацца каля 300 школьнікаў. Пры тэмпературы -10 на вуліцы і яшчэ больших маразах заняткі праводзіліся ў класах, дзе максімум +14. А гэта, зразумела, парушэнне санітарных патрабаванняў. Віцэ-прэм'ер выказаў упэўненасць, што грошы на гэта можна знайсці ў раённым і абласным бюджэтах. Трэба прапанаваць і прадпрыемствам, у тым ліку і прыватным, дапамагчы дзятве і настаўнікам. Наогул, падкрэсліў Васіль Жарко, з патэнцыйнымі мецэнатамі, спонсарамі неабходна весці перамовы больш актыўна і па розных кірунках.

Апошнім прыйшоў на прыём пенсіянер. Сказаў, што клапоціцца пра падрастаючае пакаленне, марыць, каб у Талачыне пабудавалі басейн, бо, каб навучыць дзяцей плаваць, іх даводзіцца вазіць у суседні раён Магілёўскай вобласці. Пры гэтым Талачын — буйны населены пункт, дзе больш за 9,7 тысячы жыхароў. (Усяго ў раёне — каля 25,3 тысячы.) Васіль Жарко падкрэсліў, што пытанне насамрэч патрабуе ўважлівага разгляду. Папрасіў прадстаўнікоў раённай і абласной улады падлічыць, колькі выдаткаў спатрэбіцца на будаўніцтва басейна. І апошні павінен быць не маленькім, а са стандартнымі дарожкамі (даўжынёй 25 метраў). Пазней будзе распачаты пошук крыніц фінансавання, у тым ліку, магчыма, і на рэспубліканскім узроўні...

Каментуючы журналістам уражанні ад прыёму, Васіль Жарко адзначыў, што з жыхарамі глыбінкі было цікава размаўляць. Некаторыя пытанні сапраўды маюць не толькі «мясцовую актуальнасць». На думку віцэ-прэм'ера, сустрэчы з людзьмі ў рэгіёнах даюць уяўленне пра пэўны зрэз праблем. Усе сігналы бяруцца на заметку, каб потым прымаць адпаведныя рашэнні.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*
*Талачын — Віцебск*

■ Гарадская гаспадарка

# «РАЗУМНЫ» СВЯТЛАФОР І МЕСЦЫ ДЛЯ ПАРКОЎКІ

## ЯК БУДЗЕ РАЗВІВАЦЦА ДАРОЖНА-ТРАНСПАРТНАЯ ІНФРАСТРУКТУРА СТАЛІЦЫ

**У Мінску па-ранейшаму востра стаіць праблема з заторамі, аднак ужо прыняты дзейсныя меры для яе рашэння. Напрыклад, складзена інтэрактыўная карта, якая паказвае найбольш загружаныя па розных прычынах участкі дарог, што дазваляе ацаніць матэрыяльныя страты як перавозчыкаў, так і пасажыраў, а гэта далёка не маленькія сумы — гаворка ідзе пра мільёны долараў.**

Як паведаміў **старшыня праўлення Беларускай асацыяцыі экспертаў і сюрвеераў на транспарце Юрый ВАЖНІК,** для павелічэння прывабнасці грамадскага транспарту робіцца ўсё магчымае, каб павялічыць хуткасць яго руху. У прыватнасці, усё больш распаўсюджанай становіцца практыка вылучэння для яго асобных палос, як гэта зроблена на Прывакзальнай плошчы, дзе праект акупіўся за чатыры месяцы, і вуліцы Лабанка. Акрамя таго, на такіх палосах выкарыстоўваецца спецыяльнае пакрыццё, у два разы больш зносастойкае, чым звычайнае. У планах на гэты год — увядзенне падобных палос паблізу станцыі метро Уручча і на вуліцы Кісялёва. Таксама робіцца спробы разгрузіць цэнтр ад асабістых аўтамабіляў шляхам надання прыярытэту руху грамадскаму транспарту, адмены левых паваротаў і стрымання паркоўкі транспартных сродкаў у неналежных месцах. Зараз у сталіцы абсталявана тры тысячы платных паркоўвачных месцаў, да канца гэтага года іх колькасць павінна дайсці да дзесяці тысяч.

Што датычыцца бяспекі дарожнага руху, то колькасць здарэнняў за апошнія пяць гадоў знізілася ў тры разы дзякуючы дзеянню праграмы «Добрая дарога». Па словах **намесніка начальніка УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама Андрэя ЗЫРАНАВА,** да 2021 года плануецца знізіць лік загінулых на дарогах сталіцы, што дазволіць наблізіцца да ўзроўню прызнаных еўрапейскіх лідараў у сферы дарожнай бяспекі — Стакгольма, Вены, Берліна.

З тэхнічных навінак, якія будуць апрабаваны ў мікраёне Сухарава ў бліжэйшы час, — «разумны» святлафор, які будзе ў рэжыме рэальнага часу падладжвацца пад інтэнсіўнасць руху, даючы прыярытэт найбольш загружаным напрамкам. «Ляжачыя паліцэйскія» будуць устанаўлівацца пераважна на дваровых тэрыторыях, на дарогах жа рэгуляваць хуткасць руху дапамогуць завужэнні, астраўкі бяспекі, скрыўленыя траекторыі. Гэтая методыка ўжо апрабаваная і паказала сябе з добрага боку.

**Галоўны інжынер ГП «Гардарбуд» Ігар АНДРЭЙЧЫК** паведаміў, што на 2017 год запланавана праца на 8 аб'ектах — гэта 6 кіламетраў будаўніцтва і 1,5 кіламетра рэканструкцыі. З найбольш буйных праектаў — пачатак будаўніцтва першага гарадскога транспартнага кальца на ўчастку ад вуліцы Лібкнехта да вуліцы Талстога і развязкі на скрыжаванні вуліц Маякоўскага з Аранскай.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

■ Падрабязнасці

# МУС: у «анархісткі» з Мазыра канфіскавана зброя

**Супрацоўнікі 8-га ўпраўлення (па Гомельскай вобласці) ГУБАЗіК МУС праводзілі вобыск у 22-гадовай жыхаркі Мазыра.**

Яна трапіла ў поле зроку праваахоўнікаў падчас правядзення следча-аператыўных мерапрыемстваў, разгорнутых пры расследаванні крымінальнай справы па ч.2 арт. 339 Крымінальнага кодэкса (хуліганства). У красавіку 2016 года ў Жлобіне група невядомых закідала білборды сацыяльнай рэкламы лямпамі, запоўненымі фарбай. Пра гэта паведаміў **начальнік упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Беларусі Канстанцін ШАЛЬКЕВІЧ.**

Падчас вобыску міліцыянеры знайшлі электрашокер, два газавыя балончыкі, бронекамізэльку, трэніровачны гумавы нож і два пісталеты. Акрамя таго, маладая мазыранка захоўвала дома чорна-чырвоны сцяг, тры маскі з прорезямі для вачэй, гучнагаварыцель і два дзясяткі брашур, якія прапагандавалі анархізм. Адкуль узяліся гэтыя рэчы, дзяўчына тлумачыць адмовілася. Разам з тым аператыўнікі маюць інфармацыю, што яна з'яўляецца актыўнай удзельніцай руху анархістаў.

Зброя і друкаваная прадукцыя былі накіраваны на экспертызу.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

# Узброеныя і небяспечныя

**Раскрытыя дэталі затрымання актывістаў экстрэмісцкай нацыяналістычнай арганізацыі «Белы легіён» у Беларусі. Кадры аператыўнай відэаздымкі былі паказаны ў эфіры цэнтральных тэлеканалаў.**



У прыватнасці, былі прадэманстраваны кадры затрымання ўдзельніка «Белага легіёна» Віктара Данілава. У яго рэчах знойдзены сцяг анархістаў, бронекамізэлька, спецпрыналежнасці для камплектацыі аўтаматных магазінаў і баявая зброя.

А яшчэ — прывезеныя з Украіны ўлёткі, адна з іх — памятка для ўдзельнікаў добраахвотных ваенізаваных фармаванняў. У актывіста «Белага легіёна» былі таксама чырвона-чорны сцяг, прывезены з Украіны, плакат батальёна «Азоў», памятка байцу добраахвотнага батальёна і шаўроны «Беларускага згуртавання вайскоўцаў». Прыцягнула ўвагу карціна, на якой паказаны баевікі з закрытымі балаклавамі тварамі, у касках, камуфляжнай форме побач з БТРам на фоне беларускага Дома ўрада. Адметнасць карціны — яна заліта крывёю.

Падчас вулічных акцый 90-х баевікі «Белага легіёна» былі ўдарнай сілай апазіцыі: яны прарывалі кардоны міліцыі, удзельнічалі ў беспарадках разам з украінскімі радыкаламі з УНА-УНСО ў 1996 годзе, закідвалі міліцыю камянямі ў 1999-м. У нулявых арганізацыя абвясціла аб спыненні сваёй дзейнасці, але на самай справе «Белы легіён» толькі залёг на дно. «Увесь гэты час яго байцы займаліся тым, што і раней, — праводзілі трэніроўкі ў лясах. Толькі ў прэсе гэта падавалася як патрыятычныя лагеры, дзе дзяцей вучаць любіць радзіму», — адзначаецца ў сюжэце тэлеканала АНТ.

■ Акцыя

# «Змяняй сябе, а не планету»

**Пад такім лозунгам 25 сакавіка адбудзецца адна з самых вядомых экалагічных акцый «Гадзіна Зямлі». Пад эгідай Сусветнага фонду дзікай прыроды яна праводзіцца ва ўсім свеце ўжо дзясяты раз.**

Упершыню акцыя прайшла ў Аўстраліі 31 сакавіка 2007 года. На наступны год яе падтрымалі 35 краін, больш за 400 гарадоў. Была выключана падсветка многіх вядомых помнікаў па ўсім свеце. Актыўным удзельнікам стала і наша краіна. У 2016 годзе «Гадзіна Зямлі» прайшла ў Мінску, Віцебску, Гродне, Гомелі, Брэсце, Баранавічах, Пінску, Браславе, Чавусах, дзе на адну гадзіну згасла падсветка адміністрацыйных будынкаў, гандлёвых цэнтраў, а таксама прайшлі канцэрты, лекцыі, велапрабег, выступілі тэатры ценяў. У сталіцы на адну гадзіну была выключана падсветка праспектаў Незалежнасці і Пераможцаў, агні Нацыянальнай бібліятэкі, падсветка на будынках гандлёвых цэнтраў, універсітэтаў і кавярняў.



Тэма акцыі — адказнае стаўленне чалавека да прыроды. «Гадзіна Зямлі» з'яўляецца сімвалам беражлівых адносін да яе. Удзельнічаць можа кожны, дастаткова 25 сакавіка на адну гадзіну — у 20.30 — выключыць усе электрычныя прыборы ў доме ці офісе. Такі крок будзе расцэньвацца як голас у барацьбе за ахову навакольнага асяроддзя.

Напрыклад, вось як плануюць правесці акцыю ў трох інтэрнатах БДУ. 24 сакавіка на старт выйдуць актывісты Студэнцкага гарадка і насельнікі інтэрната №5 па вуліцы Кастрычніцкай. У будынку ў 20.00 на гадзіну будуць адключаны ўсе электрапрыборы. На наступны дзень, 25 сакавіка, эстафету падхопяць яшчэ два студэнцкія інтэрнаты. У 20.00 добраахвотна выключаць святло ў жылых памяшканнях, у рабочых кабінетах і нават будзе прыпынена работа ліфтаў у інтэрнаце №1 па вуліцы Свярдлова, а ў 20.30 — у інтэрнаце №4 па вуліцы Чурлёніса. Апроч таго, тут пройдзе шэраг тэматычных мерапрыемстваў, скіраваных на выхаванне культуры энергаспажывання, а таксама прыцягненне ўвагі моладзі да праблем экалогіі, звязаных са змяненнем клімату на планеце.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

■ Рынак лекаў

# Перспектывы айчыннай фармацэўтыкі

## Залежнасць краіны ад імпарту павінна быць зніжана пры захаванні якасці і эфектыўнасці лекавых прэпаратаў

**Аб'ём фармацэўтычнага рынку склаў летась амаль 637 млн долараў, што на 4 працэнты менш, чым у 2015-м. Але, хутчэй за ўсё, тэндэнцыяй гэта не стане і рынак адновіцца. Доля айчынных лекаў у коштавым выражэнні наблізілася да 52 працэнтаў, 70 працэнтаў аб'ёму вытворчасці забяспечваюць дзяржаўныя прадпрыемствы. Экспарт летась вырас у параўнанні з папярэднім годам і склаў 115 млн долараў.**

Увогуле, у краіне зарэгістравана звыш 4,5 тысячы найменняў лекаў розных вытворцаў, 1,6 тысячы з іх — айчынныя, сярод якіх ёсць супрацьпухлінныя, для лячэння захворванняў нервовай сістэмы, апорна-рухальнага апарату, афтальмалагічных захворванняў і іншыя. «Асноўным кірункам у распрацоўцы лекавых сродкаў у апошняе дзесяцігоддзе было імпартазамяшчэнне, распрацоўка генерычных лекаў (копій арыгінальных), якія не саступаюць па якасці і эфектыўнасці арыгінальным, але больш даступныя па кошце і зніжаюць залежнасць краіны ад імпарту», — кажа **начальнік упраўлення арганізацыі вытворчасці і перспектыўнага развіцця Дэпартамента фармацэўтычнай прамысловасці Міністэрства аховы здароўя Беларусі Таццяна ТУМЕЛЯ.**

У апошнія гады на рынак штогод пастаўляецца не менш за сотню айчынных навінак. У 2015 годзе было наогул 180, летась крыху менш — 116. Ужо сёлета з'явіцца сучасны лекавы сродак супраць гепатыту С айчыннай вытворчасці. Пакуль мы фасуем і пакуем сафасбувір пад гандлёвай назвай «Гепасофт» егіпецкай кампаніі Global Napi Pharmaceuticals. Прэпарат зарэгістраваны і выходзіць на рынак, але ёсць жаданне і магчымасці вырабіць яго па поўным цыкле. У адрозненне ад супрацьвіруснай тэрапіі інтэрферонам і рыбаверынам новыя лекі маюць шэраг пераваг. Яны выпускаюцца ў капсулах і таблетках, добра пераносяцца.



Беларускія лекі таннейшыя за імпартныя аналагі за кошт іншых тэхналогій іх распрацоўкі і вытворчасці, адсутнасці затрат на прасоўванне. Так, на распрацоўку арыгінальнага прэпарату і яго вывядзенне на рынак патрабуецца не менш за дзесяць гадоў і каля 1 млрд долараў. Вынайсці новы прэпарат — значыць даследаваць каля 10 тысяч малекул, толькі адна з якіх стане паспяховай. Нядаўна на рынак выйшаў новы прэпарат для лячэння пласкаклетачнага раку лёгкіх — пеметрэксед. У 2014 годзе адзін флакон арыгінальнага прэпарата каштаваў 2,6 тысячы долараў, а на курс хвораму патрабуецца 5—7 флаконаў. Нашы навукоўцы ўжо знізілі кошт да 1 тысячы долараў дзякуючы зніжэнню сабекошту субстанцыі.

Інстытут біяарганічнай хіміі НАН Беларусі працуе і над таргетнымі прэпаратамі, якія пашкоджваюць клеткі пухліны, але не шкодзяць іншым. Такія лекі больш эфектыўныя і пры гэтым бяспечныя. «Акадэмфарм» выпускае іматыніб, які вырабляўся спачатку з пакупной субстанцыі, а цяпер — стабільна з айчыннай. У рабоце знаходзіцца і таргентны прэпарат для лячэння некаторых вельмі «злых» пухлін печані і ныркі. Падаць дакументы на рэгістрацыю гатовай лекавай формы плануецца ўжо сёлета.

— Для стварэння інавацыйных лекавых сродкаў неабходны кадры з адпаведным вопытам, спецыялізаваныя лабараторыі інстытутаў і належнае фінансаванне, — разважае **старшыня назіральнага савета Саюза медыцынскіх фармацэўтычных і навукова-адукацыйных арганізацый «Медыцына і фармацэўтыка — інавацыйныя праекты» Аляксей СЫЧОЎ.** — У краіне спецыялісты ёсць у навукова-даследчых інстытутах, а сусветная практыка паказвае, што 90 працэнтаў інавацыйных прэпаратаў былі распрацаваныя сіламі фармпрамысловасці. Таму для нас важнае развіццё дзяржаўна-прыватнага партнёрства, калі спецыялісты з тых жа інстытутаў змогуць працаваць у адной камандзе з прадстаўнікамі бізнесу. У свеце даўно распаўсюджана кааперацыя для правядзення навуковых даследаванняў і вырабу лекаў, напрыклад, для лячэння анкалогіі. Патрабуюцца таксама эксперыментальныя лабараторыі для правядзення пачатковых даследаванняў па распрацоўцы новых малекул, і там павінны быць самыя сучасныя тэхналогіі для біямадэлявання, лабараторыі для правядзення даклінічных даследаванняў, базы для клінічных выпрабаванняў. Усе яны павінны мець міжнародную акрэдытацыю і адпавядаць міжнародным стандартам. Пакуль такога ў Беларусі няма.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

■ Спажывец

# НІЯКІХ ЛЕКАЎ ПРАЗ ІНТЭРНЭТ

## А прадавацць у сацыяльных сетках можна толькі асабістыя рэчы

**Летась колькасць зарэгістраваных інтэрнэт-крамаў у краіне павялічылася амаль на 23 працэнты — плюс 2,5 тысячы новых аб'ектаў. За апошнія чатыры гады іх стала больш амаль удвая. Не дзіўна, што рэгуляванню электроннага гандлю надаецца ўсё больш увагі. Як абараніць спажыўцоў у новых умовах? Гэтыя пытанні абмяркоўвалі эксперты ў прэс-цэнтры БЕЛТА.**

### Неабдуманыя здзелкі — ад няведання

За парушэнне заканадаўства летась інтэрнэт-крамам выдадзена 42 прадпісанні, састаўлены 41 пратакол. Парушэнні часцей за ўсё былі звязаны з тым, што на сайтах змяшчалася недакладная ці няпоўная інфармацыя аб тавары.

— Заканадаўствам забаронены анлайн-продаж ювелірных вырабаў, піратэхнікі, лекаў, БАДаў, ветэрынарных сродкаў, зброі, спецыялізаванай прадукцыі для харчавання спартсменаў, алкагольных напояў і тытунёвых вырабаў, — звяртае ўвагу **начальнік упраўлення абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Ірына БАРЫШНІКАВА.** — Але мы вельмі часта сутыкаемся з тым, што ў сацыяльных сетках прапануюць медпрэпараты, прадукты харчавання, якія быццам валодаюць лячэбнымі ўласцівасцямі.

Гандаль у сацсетках у прынцыпе лічыцца незаконным. Адзінае, што можна прадаваць такім чынам, — асабістыя рэчы, якія былі ва ўжыванні.

Каб не нарвацца ў інтэрнэце на нядобрасумленнага камерсанта, МАРГ раіць правяраць, ці ёсць гэтыя інтэрнэт-крама ці ІП у рэестры. «Трэба мець інфармацыю аб тым, з кім збіраешся заключыць дагавор. Таму вядзенне рэестраў — важны складнік у сферы абароны правоў спажыўцоў. Таксама на сайтах міністэрстваў арганізаваны рубрыкі з карыснай інфармацыяй для грамадзян. Напрыклад, на сайце Дзяржстандарта змяшчаюцца навіны аб прыпыненых і адмененых сертыфікатах адпаведнасці, Мінскводаканал дазваляе праверыць якасць водаправоднай вады па вашым адрасе. Менавіта ад няведання нашы спажыўцы часам робяць неабдуманыя і дарагія здзелкі», — падкрэсліла Ірына Барышнікава.

### Новыя змяненні ў законе

У лютым уступілі ў сілу змяненні ў Кодэкс аб культуры аб вяртанні грошай за адмененае культурна-забаўляльнае мерапрыемства. Аплату павінны вяртаць спажыўцу на працягу сямі дзён з моманту запланаванага спектакля ці фестывалю. «Раней арганізатар канцэрта мог вяртаць грошы ў тэрмін, які ён сам устанаўліваў. Гэта даходзіла да паўгода, і нават да года», — заўважае Ірына Барышнікава.

Пэўныя змяненні збіраюцца ўнесці таксама ў Закон «Аб абароне правоў спажыўцоў». Напрыклад, забараніць устанаўліваць розныя цэны ў залежнасці ад формы аплаты тавараў і паслуг: часта бывае, што пры разліку наяўнымі прадаўцы выстаўляюць адну суму, а па картцы — іншую. Спіс абавязковай інфармацыі аб тавары плануюць дапоўніць звесткамі аб краіне яго паходжання (калі яна не супадае з месцам знаходжання вытворцы) і класе энергаэфектыўнасці. Сярод прапаноў — таксама павелічэнне тэрміну гарантыйнага рамонту з 14 да 30 дзён, абавязак гарантыйных майстэрняў па заяўцы прадаўцоў правяраць якасць тавару на працягу трох дзён з моманту яго атрымання, права пастаўшчыкам на спагнанне са спажыўца страт за захоўванне тавару, які быў адрамантаваны ці прайшоў экспертызу, па заканчэнні двух месяцаў з дня пісьмовага папярэджання спажыўца.

Мяркуецца, што новая рэдакцыя закона будзе прынята да канца года.

### Арбітры па банкаўскіх спрэчках

Навацыі, дарэчы, чакаюцца і ў сферы абароны правоў спажыўцоў фінансавых паслуг. У краіне з'явяцца фінансавыя арбітры: з іх дапамогай можна будзе вырашаць спрэчкі паміж кліентамі і банкамі без звароту ў суд.

— Так, у нас ёсць такія альтэрнатыўныя спосабы вырашэння канфліктаў, як медыяцыя і трацейскія суды, але, як паказала практыка, яны незапатрабаваныя ў тых выпадках, калі размова ідзе пра адносіны грамадзян і арганізацый. Разгляд справы трацейскім судом з'яўляецца платным, і часта сума, што аспрэчваецца, ніжэйшая за тыя выдаткі, якія нясуць бакі, — тлумачыць **намеснік начальніка ўпраўлення законапраектных работ і экспертызы нарматыўных прававых актаў галоўнага юрыдычнага ўпраўлення Нацбанка Віталь САРОКІН.** — Фінансавыя арбітры будуць мець шэраг пераваг. Па-першае, іх паслугі бясплатныя для грамадзян. Па-другое, рашэнні, якія выносяцца, уступаюць у сілу праз 10 дзён і маюць абавязковы характар. Выдаецца дакумент, які можна прад'явіць судоваму выканаўцу для прымусовага спагнання. Плюс справа будзе разглядацца ў спрошчаным парадку, у больш кароткія тэрміны, патрабуецца мінімальная колькасць дакументаў.

Мяркуецца, што фінансавыя арбітры будуць вырашаць спрэчкі, сума па якіх не перавышае 500 базавых велічынь (каля 5 тысяч долараў), і толькі пасля таго, як грамадзянін звернецца з пісьмовай прэтэнзіяй да банка.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*


Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Оршаагропроммаш», Витебская обл., г. Орша, ул. Ленина, 215 |

**Предмет аукциона**

| Наименование (назначение), общая площадь, инвентарный номер, адрес расположения | Составные части и принадлежности |
|---|---|
| **Лот №1** | |
| **Здание цеха №4** (здание специализированное иного назначения), 4043,2 кв. м, 240/С-40713, г. Орша, ул. Селицкого, 2/1 | Здание цеха №4; автомобильные дороги; Наружная канализация; Наружный водопровод; Кабельная линия |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. 0,7965 га, предоставлен продавцу для обслуживания здания цеха №4 на праве постоянного пользования | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 404 973 руб. 60 коп.** (снижена на 20%) | |
| **Лот №2** | |
| **Центральный растворный пункт** (здание неустановленного назначения), 202,9 кв. м, 240/С-43224, г. Орша, пер. Заводской 2-й, 23Б | Центральный растворный пункт; Насосная станция ППТ; Сход; Емкости; Наружная канализация; Благоустройство |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. 0,3222 га, предоставлен продавцу для обслуживания здания центрального растворного пункта на праве постоянного пользования | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 66 443 руб. 26 коп.** (снижена на 20%) | |
| **Лот №3** | |
| **Здание склада ГСМ** (здание специализир. складов, торг. баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ), 28,3 кв. м, 240/С-43037, г. Орша, ул. Владимира Ленина, 215Б | Склад ГСМ; Благоустройство |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. 0,2492 га, предоставлен продавцу для обслуживания здания склада ГСМ на праве постоянного пользования | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 13 400 руб. 00 коп.** (снижена на 20%) | |
| **Лот №4** | |
| **Очистные сооружения** (сооружение специализир. коммунального хозяйства), 240/С-43220, г. Орша, ул. Людвига Селицкого, 2В | |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. 0,1283 га, предоставлен продавцу для обслуживания очистных сооружений на праве постоянного пользования | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 20 558 руб. 90 коп.** (снижена на 20%) | |
| **Лот №5** | |
| **Здание материального склада** (здание специализир. складов, торг. баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ), 1406,2 кв. м, 240/С-42936, г. Орша, ул. Владимира Ленина, 215Ж | Здание материального склада; Наружная канализация; Производствен. автомоб. дороги; Кабельная линия (низковольтная) |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. 0,7922 га, предоставлен продавцу для обслуживания здания материального склада на праве постоянного пользования | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 177 871 руб. 19 коп.** (снижена на 20%) | |
| **Лот №6** | |
| **Здание стройгруппы** (здание специализир. для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель), 574,7 кв. м, 240/С-42940, г. Орша, ул. Владимира Ленина, 215В | Здание стройгруппы; Наружная канализация; Производственные дороги; Кабельная линия (низковольтная); Забор вокруг территории завода |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. 0,3123 га, предоставлен продавцу для обслуживания здания стройгруппы на праве постоянного пользования | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 87 870 руб. 94 коп.** (снижена на 20%) | |
| **Лот №7** | |
| **Склад запчастей** (здание специализир. складов, торг. баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ), 1669,9 кв. м, 240/С-42939, г. Орша, ул. Владимира Ленина, 215Д | Склад запчастей; Наружная канализация; Производственные дороги; Кабельная линия (низковольтная); Забор вокруг территории завода |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. 0,3880 га, предоставлен продавцу для обслуживания здания склада зап. частей на праве постоянного пользования | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 223 155 руб. 84 коп.** (снижена на 20%) | |
| **Лот №8** | |
| **Здание склада** (здание специализир. складов, торг. баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ), 62,1 кв. м, 240/С-42996, г. Орша, ул. Людвига Селицкого, 2Б | |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. 0,0886 га, предоставлен продавцу для обслуживания склада на праве постоянного пользования | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 9 728 руб. 76 коп.** (снижена на 20%) | |
| **Лот №9** | |
| **Здание столовой** (здание специализир. для общественного питания), 1778 кв. м, 240/С-28818, г. Орша, ул. Владимира Ленина, 215А | Здание столовой; Наружная канализация; Наружный водопровод; Кабельная линия низковольтная |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. 0,1256 га, предоставлен продавцу для обслуживания здания столовой на праве постоянного пользования. Ограничения прав на зем. участок: охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения пл. 0,0031 га | |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 497 415 руб. 23 коп.** (снижена на 20%) | |

**Обременения**: частичная аренда. Подробности на сайте организатора аукциона www.cpo.by

**Задаток 1%** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010, в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после снятия продавцом в установленном законодательством порядке всех зарегистрированных ограничений (обременений)

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в **газете «Звезда» от 25.01.2017**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

**Аукцион состоится 05.04.2017 в 11.00** по адресу:
**г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703.**
**Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 04.04.2017 до 17.00** по указанному адресу.
**Тел.: +375 17 280-36-37; 8029-317-95-42. www.cpo.by.**
**Email: auction@cpo.by**

TV@R

# Алесь МУХІН: «Некалькі гадоў вучыўся не хварэць за знатакоў»

**Сёння ў эфіры тэлеканала АНТ выходзіць першая гульня вясновай серыі «Што? Дзе? Калі? у Беларусі». Да канца красавіка за званне найлепшай будуць змагацца пяць камандаў знатакоў. Нашы карэспандэнты ў якасці гасцей студыі пабывалі на здымачнай пляцоўцы праекта, у рэжыме рэальнага часу паназіралі за гульнёй, а таксама атрымалі магчымасць задаць некалькі пытанняў спадару вядучаму. Пра адметнасці беларускага інтэлектуальнага тэлеклуба, моду быць разумным і ступені адбору пытанняў для гульні за тым самым знакамітым люстраным сталом мы гутарым з уладальнікам Хрустальнай савы і ганаровага звання «Найлепшы капітан клуба 2001—2005 гадоў» Алесем МУХІНЫМ.**

***— Распачынаецца ўжо дзявяты сезон інтэлектуальнай гульні «Што? Дзе? Калі? у Беларусі». За час існавання праекта нешта змянілася?***

— У кожным сезоне мы стараемся ўводзіць навінкі, якія дапамаглі б, з аднаго боку, камандам адчуваць сваю адказнасць за паказаныя вынікі, а з іншага — і гледачам было б цікава сачыць за нейкімі новымі, больш жорсткімі рэаліямі гульні. За час існавання праекта вельмі моцна вырас узровень камандаў. Калі ў пачатку гуляла 13 камандаў знатакоў, то сёння іх засталося 7. Гэта значыць, што адбываецца досыць жорсткі адбор. Напрыклад, было загадзя аб'яўлена, што дзве найгоршыя каманды па выніках мінулага года пакідаюць клуб. У тым ліку не пашанцавала жаночай зборнай Алены Повышавай, якая была адным з сімвалаў клуба ўсе папярэднія восем сезонаў. Акрамя таго, увялі дадатковыя правілы для 13-га сектара: цяпер знатакі або ўсе разам адказваюць на пытанне датэрмінова, або застаюцца за сталом трое, але яны маюць толькі 20 секундаў на абмеркаванне, або застаецца адзін ігрок (як пры вырашальным раўндзе суперрбліца), і ён думае хвіліну. Ёсць спецыяльныя сектары ад нашых партнёраў з закавырыстымі пытаннямі. У цэлым, імкнёмся, каб наша праграма пры ўсёй сваёй уяўнай ідэнтычнасці ўзорам 70—80—90-х гадоў развівалася і ішла наперад. Так, з'явіліся відэапытанні, і мы думаем над павелічэннем іх колькасці. Маем шмат аўтараў, якія практычна падчас кожнай сваёй паездкі стараюцца знайсці нейкі адметны відэафакт, зняць яго і даслаць нам. Праграма развіваецца.

***— «Што? Дзе? Калі?» — гэта не толькі клуб знатакоў, але і пэўная супольнасць тэлегледачоў, якія дасылаюць пытанні. Маеце сталых аўтараў?***

— Так, ёсць нават цэлыя пакаленні сем'яў. Напрыклад, пачынала пісаць бабуля, затым прадоўжылі дзеці, а цяпер нам пішуць унукі. Сумесна з Міністэрствам адукацыі вось ужо трэці год ладзім конкурс на лепшае пытанне ад школьніка. Пераможца атрымлівае спецыяльны прыз — паездку ў Нацыянальны лагер «Зубраня». Шмат пытанняў дасылаюць студэнты. Праект ужо некалькі гадоў таму перасягнуў межы Беларусі. Калі, напрыклад, у Маскве, Кіеве, Баку могуць гуляць прадстаўнікі розных краін, то ў нас знатакамі становяцца толькі беларусы. Але пытанні нам дасылаюць гледачы і з-за мяжы. Цікава, што фінал сезона 2016 года ў інтэрнэце набраў каля 40 тысяч праглядаў, што для інтэлектуальнай гульні нямала.

***— Усё яшчэ актуальнае сцвярджэнне, што разумным быць крута, модна і не варта спядзявацца толькі на google?***

— Менавіта так. Наш праект прызначаны для прапаганды інтэлектуальнага ладу жыцця, таму, магчыма, мая сацыяльная місія па жыцці — не ў тым, каб прадстаўляць Беларусь у маскоўскім клубе «Што? Дзе? Калі?», а ў тым, каб даць магчымасць і жыхарам нашай краіны пабачыць, што нават хлопец з суседняга двара можа гуляць, выйграваць і атрымліваць Хрустальную саву. Варта задаць сабе пытанне: чаму я ці мой сын, дачка так не могуць? Звярніце ўвагу, у нас унутры праграмы многа дыялогаў пра тое, хто дзе вучыцца, працуе, як дапамагае розум у жыцці. Сапраўды, разумным быць модна. Нават класічным інтэр'ерам, падсвечнікамі, афармленнем студыі мы паказваем моладзі, што крута быць інтэлектуалам.


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

***— Прадстаўляючы кожнага знатака, вы кажаце не толькі пра яго від дзейнасці, але і пра тое, адкуль ён прыехаў, хоць цяпер і жыве ў Мінску ці іншым горадзе. Гэта вы робіце, каб ім ганарыліся на малой радзіме?***

**«Тут без эмоцый, нерваў, драйву, нават істэрыкі, немагчыма. Можа, гэта і ёсць сакрэт папулярнасці тэлепраекта».**

— Самі знатакі выбіраюць, як іх прадставіць. Але нават калі яны стала жывуць у Мінску ўжо некалькі гадоў, то часта сябе называюць не мінчанамі, а жыхарамі роднага горада.

***— Вам самому карціць сесці за стол і таксама згуляць разам са знатакамі?***

— Вельмі хочацца. Мне вельмі падабаецца якасць пытанняў, якія дасылаюць тэлегледачы. Яна ўвесь час расце. І самі знатакі адзначаюць, што гуляць, з аднаго боку, складаней з-за моцных пытанняў, але і цікавей, бо тэлегледачы шукаюць надзвычай цікавыя факты для пытанняў. І мне іх прыемна задаваць.

***— Хварэеце больш за знатакоў ці за тэлегледачоў, якія дасылаюць пытанні?***

— Гэта вельмі цяжкае маральнае пытанне. Некалькі гадоў я вучыўся не хварэць за знатакоў. З аднаго боку, прысутнічае агульны карпаратыўны дух, мы ўсё ж адна сям'я са знатакамі. Але з іншага, я разумею, што тэлегледачы, якія дасылаюць нам пытанні, таксама прайшлі вялікі творчы шлях. Трэба ж знайсці факт, сфармуляваць пытанне, часам — зняць яго на відэа. Я разумею, што эфект саўдзелу дазваляе абаронцам інтарэсаў гледачоў часам прысуджаць знатакам ачко, нават калі яны не да канца адказалі на пытанне. Таму калі я бачу, што гэта адбываецца, то абараняю тэлегледачоў. Хто, калі не я?

***— Маеце любімых ігракоў? Магчыма, нейкія каманды вам асабліва сімпатычныя?***

